# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
23 лютага
1995 года
№ 3(1721)


## АНОНС



Да

## ВАНЯ АНДРЫЯНАЎ:

*«Я перажыў шок, вярнуўшыся дадому»*

Інтэрв'ю са студэнтам-чацвертакурснікам фізічнага факультэта, які год пражыў у Амерыцы, чытайце ў наступным нумары.

І пасля



---

*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» віншуе ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта з днём абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь!*

## НЕ ЗУСІМ АНАРХІЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ АНАРХІСТАЎ

Візіту Б. М. Ельцына на Беларусь нефармальнае аб'яднанне студэнтаў, якія прытрымліваюцца анархісцкіх поглядаў прысвяціла аукцыён. На продаж прадстаўлена карціна калектыўнай вытворчасці «Борис Николаевич Ельцин водружает российское знамя над Президентским Дворцом в городе Грозном». Мэта акцыі — палітычная правакацыя пры дапамозе мастацтва. Памятаеце, як у Маякоўскага «борющееся искусство против буржуев»?

Гэта акцыя дапаўняе акцыю «ракетно-точечный удар», праведзеную актывістамі нефармальнага аб'яднання каля расійскага пасольства, і з'яўляецца часткай акцый супраць вайны ў Чачне.

## Дан загад яму...

Міністэрства абароны Расіі прадставіла ў Дзярждуму праект, па якому студэнты ў тэрміновым парадку павінны адбываць вайсковую службу.

Як ведаць, ці не прадставіць у хуткім часе па расійскаму прыкладу Міністэрства абароны Беларусі аналагічны праект у Парламент. Ва ўсякім разе, ці не рана нам пакідаць віншаванні са святам 23 лютага мужчынскай паловы студэнцтва?

## ...А кажуць вясна — час кахання...

Інстытутам фізіка-хімічных праблем (НДІ ФХП), які дзейнічае пры хімічным факультэце, вядзецца падрыхтоўка да навуковай канферэнцыі супрацоўнікаў хімічнага факультэта і НДІ ФХП, якая павінна адбыцца ў красавіку.

## НЯЎЖО?!

Усё большай павагай карыстаецца ў студэнтаў прафсаюзны камітэт. Бо сёння гэта адзіная арганізацыя, якая захоўвае правы студэнтаў, займаецца выдачай пуцёвак на санаторнае і прафілактычнае лячэнне, размяркоўвае матэрыяльную дапамогу, займаецца бытам студэнтаў і праводзіць культурна-масавыя мерапрыемствы. Аб тым, што давер студэнтаў да прафсаюзаў вялікі, сведчыць той факт, што 95 % першакурснікаў атрымалі прафсаюзныя білеты.

## ПРЭСТЫЖ ПРЭСТЫЖАМ, А ЖАРТЫ ЖАРТАМІ

Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што прафесія юрыста сёння адна з самых прэстыжных. І гэта, па вызначэнню саміх студэнтаў, надае ім вялікае пачуццё адказнасці. У кагосьці складзецца думка, што будучым юрыстам — «не да жартаў». Аднак гэта не так, і гульня КВЗ падцвердзіла гэта. У 1994 годзе каманда КВЗ юрфака адрадзілася і ў лепшым выглядзе паказала сябе. І хаця не стала яна пераможцам, аднак кепскі той салдат, які не марыць стаць генералам. Тым больш, што балельшчыкі ў каманды самыя актыўныя.

## СПАЛУЧЫМ?..

На філфаку поўным ходам ідзе падрыхтоўка гульні клуба вясёлых і знаходлівых паміж студэнтамі і выкладчыкамі. Гульня павінна адбыцца 8-га сакавіка. Вось гэта свята!

Кацярына ТКАЧЭНКА

---

# ЧАЛАВЕК ПЕРШАЙ ПАЛАСЫ

## «ЭКЗАМЕН — ГЭТА ЗАЎСЁДЫ РАЗМОВА НА РОЎНЫХ»



***На стале прафесара Старабінца — манаграфія «Аб вадзе» пад рэдакцыяй Фрэнкса — амерыканскага вучонага. Арыгінал. Побач з манаграфіяй — англа-рускі слоўнік. Вось ужо сапраўды — век жыві, век вучыся. Член-карэспандэнт АН Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч навукі РБ, доктар хімічных навук, з нядаўняга часу Сорасаўскі прафесар Георгій Лазаравіч СТАРАБІНЕЦ за амаль 60 гадоў сваёй навуковай дзейнасці напісаў больш за 400 работ. Колькі ж прачытаў не падлічыць нават сам Георгій Лазаравіч. Больш за 30 год ён загадваў кафедрай аналітычнай хіміі. Зараз працуе галоўным навуковым супрацоўнікам лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы НДІ фізіка-хімічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У гэтым годзе прафесар Старабінец адзначыць сваё 85-годдзе і ўзначаліць камісію па прыёму дзяржаўных экзаменаў.***

**— Георгій Лазаравіч, Вам упершыню давядзецца быць старшынёй дзяржкамісіі?**

— Так. Да гэтага я толькі ўваходзіў у склад камісіі.

**— На Вашу думку, вельмі цяжка здаваць экзамены прафесару Старабінцу?**

— Думаю, што не. Я імкнуся стварыць на экзамене атмасферу добразычлівасці: студэнт менш хвалюецца і паказвае больш глыбокія веды. Экзамен — гэта заўсёды размова на роўных. Ніколі нікога не «рэзаў», але калі бачыў, што студэнт зусім не падрыхтаваўся да экзамена, прапаноўваў прыйсці да мяне яшчэ раз. Аднак і ліберальнасці таксама было ў меру. Галоўнае — правільна спалучаць ліберальнасць і строгасць. Я патрабую ведаў, і гэта справядліва.

**— А такое «вынаходніцтва» студэнтаў, як шпаргалка...**

— А тут увогуле ўсё проста. На такія рэчы я ўвагі не звяртаю. Напэўна, студэнты на экзамене і карыстаюцца шпаргалкамі, але яны дапамагаюць ім толькі да часу. Я высветлю іх сапраўдныя веды пры дапамозе дадатковых пытанняў. У шпаргалку ўсяго не запішаш, ці не так?

**— Шмат людзей называюць Вас сваім настаўнікам. Каго б Вы назвалі сваім?**

— Часцей мне даводзілася працаваць самастойна, але вялікі ўплыў на мяне аказалі лекцыі Мікалая Фёдаравіча Ярмоленкі, першага загадчыка кафедры.

**— Як змяніліся студэнты ці студэнцтва ўвогуле за апошнія гады?**

— Знізілася цікавасць да навукі.

**— Вы лічыце сябе ўдачлівым чалавекам?**

— Так, безумоўна. Я перажыў вайну і не быў цяжка паранены, я займаюся любімай справай і ў мяне таленавітыя вучні. Напрыклад, Салдатаў і Рахманько нядаўна абаранілі доктарскія дысертацыі.

**— Што дапамагае падтрымліваць сябе ў форме?**

— Штодзённая гімнастыка.

**— «Усім добрым у сабе я абавязаны кнігам...»**

— ...мастацкай літаратуры — мемуарнай і гістарычнай. Захапляюся гісторыяй Старажытнай Грэцыі і Рыма. Люблю чытаць кампазітараў. За глыбіню паважаю Ф. М. Дастаеўскага.

***Пад час нашай размовы ў кабінет Георгія Лазаравіча зайшоў той, на каго прафесару вельмі пашанцавала ў жыцці — яго вучань Рахманько Яўген Міхайлавіч, цяперашні загадчык кафедры аналітычнай хіміі, і згадзіўся адказаць на мае пытанні.***

**— Свой першы экзамен у Георгія Лазаравіча Вы, канешне, запомнілі?**

— Гэта было 12 снежня, яшчэ да пачатку сесіі, бо здавалі экзамен датэрмінова. Я займаўся па індывідуальнаму графіку, накшталт сённяшняга вольнага наведвання для тых, хто добра вучыцца, вельмі хваляваўся — імя прафесара Старабінца было ўжо добра вядомым.

Можа, у семестры я крыху не дапрацоўваў, але да экзаменаў рыхтаваўся сур'ёзна. Здарылася так, што перад экзаменам у мяне зламалася электрабрытва. Непаголены, я прыехаў на экзамен. Я адказаў, а калі выйшаў з аудыторыі, Георгій Лазаравіч зазначыў: «Пірат, але адказваў добра». Гэта мне потым аднакурснікі расказвалі.

**— Маглі б Вы назваць Георгія Лазаравіча сваім настаўнікам? Я не маю на ўвазе толькі хімічную лабараторыю...**

— Ён уплываў і на наш светапогляд. Яшчэ ў тыя часы, калі мы вывучалі сваю гісторыю паводле гісторыі КПСС, Георгій Лазаравіч часта расказваў нам пра калектывізацыю, пра тую булачку, якую студэнт з'ядаў, не паспеўшы дайсці да інтэрната. Пра жыццё... Але галоўнае, чаму ён мяне навучыў — гэта захапленне справай.

**— Так, сённяшніх студэнтаў навука не вельмі вабіць?**

— Звязана гэта з нізкім узроўнем аплаты навукоўцам. Зараз мы выдзяляем пазабюджэтныя сродкі. Грант Сораса дазваляе выплочваць аспірантам дадатковыя грошы. Студэнты падрабляюць у лабараторыях, бо вядома, што «аналітычная хімія пачынаецца з мыцця посуду».

***Георгій Лазаравіч Старабінец вельмі дружны з тымі студэнтамі, якія праяўляюць цікавасць да навукі. Адносіны прафесара з такімі студэнтамі нельга ўціснуць у межы «выкладчык-студэнт», гэта заўсёды сябры. І тут два сябры — былы і цяперашні загадчык кафедры аналітычнай хіміі, успомнілі, як рамантавалі падвал на дачы.***

Алёна ШАЎКУН.

# Больш ведаў — больш святла для студэнта

Гістфаку ўжо 50 гадоў, аднак спецыялістаў па міжнародных адносінах тут рыхтуюць толькі трэці год. І менавіта на студэнтаў аддзялення міжнародных адносін гістфака БДУ разлічана бібліятэчка кніг на англійскай мове, што перадалі першы сакратар пасольства ЗША на Беларусі Дж. Дэмірэй і яго калегі К. Тэрнер і Л. Арэшкіна. Гэта слоўнікі, томікі Збігнева Бжэзінскага, спецыяльная літаратура, так неабходная студэнтам сёння.

## ● ВЕСТКІ З ГАЛОЎНАГА КОРПУСА

Паводле вынікаў конкурсу па праграме «ТЭМПУС» (праграме міжнароднага універсітэцкага супрацоўніцтва) два сумесныя праекты беларускіх, французскіх і англійскіх універсітэтаў былі заўважаны і атрымалі жыццё. Тэмы праектаў — «Стварэнне школы камунікацый у Белдзяржуніверсітэце», «Паляпшэнне кіравання універсітэтам».

На ажыццяўленне гэтых праектаў Еўрапейскім супольніцтвам Белдзяржуніверсітэту была выдзелена значная сума — адзін мільён долараў. Грошы будуць выкарыстоўвацца па трох напрамках: на закупку мэтавага абсталявання (камп'ютэры, ксераксы і г. д.), запрашэнне лепшых выкладчыкаў з-за мяжы і накіраванне супрацоўнікаў і студэнтаў для навучання ў розныя універсітэты еўрапейскіх краін.

А з 30 снежня па 4 лютага праходзіла сумесная канферэнцыя французскіх і беларускіх палітолагаў, сацыёлагаў і журналістаў, прысвечаная навучанню спецыялістаў па тэорыі камунікацый.

# Гуляючы, вучыце мову

***Нават самым заўзятым гультаём авалодае неадольная прага да ведаў, калі патрымае ён у руках вучэбныя матэрыялы, якія прапануе выдавецтва «Лексіс».***

Гэта фірма — адзіны прадстаўнік Еўрапейскага Лінгвістычнага Інстытута (Італія) у нашай рэспубліцы. Вучэбныя методыкі ELI настолькі займальныя і арыгінальныя, што нават дашкаляты авалодваюць азамі замежнай мовы без асаблівых складанасцей. Не гаворачы ўжо аб школьніках, студэнтах і зусім дарослых людзях. Нездарма па гэтых методыках працуюць даўным-даўно педагогі 45 краін свету.

«Лексіс» прапануе гадавыя падпіскі на вучэбныя часопісы на англійскай, французскай, іспанскай, італьянскай, нямецкай і нават лацінскай мовах, вучэбныя курсы, фліп-постэры, плакаты, слоўнікі, граматыкі, метадычныя дапаможнікі для выкладчыкаў і рабочыя сшыткі для школьнікаў і студэнтаў, якія выдадзены вядомымі ў свеце выдавецтвамі: Оксфардскага і Кэмбрыджскага універсітэтаў, «Penguin», «Longman», «Heinemann», «BBC-Englich», «Collins».

Нават калі вельмі таго прагнуць, немагчыма «зубрыць» гэтыя дапаможнікі, таму што аб'ядноўвае іх дэвіз: «Вучыцеся, гуляючы!» і выдатная якасць паліграфічных работ.

Вы жадаеце ўпэўніцца на ўласныя вочы? Кожны чацвер з 11 да 15 гадзін можна сустрэцца з прадстаўнікамі фірмы «Лексіс» у холе галоўнага корпуса універсітэта.

# «Я ніколі не буду эмігранткай»

*На працягу трох месяцаў праходзіла стажыроўку ў Амерыцы ў Масачусетскім інстытуце тэхналогіі (штат Масачусетс, г. Бостан) Л. П. Саянкова, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі. З ёй размаўляе карэспандэнт «Беларускага універсітэта» Марына Гуляева.*



**— Людміла Пятроўна, Вы накіраваліся ў гэтую паездку з пэўнай настроенасцю на нешта. Атрымалі Вы тое, што хацелі?**

— У мяне была ўстаноўка на тое, што я еду вучыцца. Вы ведаеце, я адна з тых жанчын, пра якіх казаў Ландаў: «Жанчына вылучаецца адной асаблівасцю: яна любіць вучыцца». Я люблю вучыцца. Гэта значыць, для мяне лішняя нагода павучыцца — ніякая не нагрузка, не цягамоціна. Я проста абажаю насычаць сябе інфармацыяй. Розум, адукацыя — гэта тое, што выклікае ў мяне абажанне.

Я ведала, што ў Амерыцы атрымаю аграмадную колькасць літаратуры. Той, якую, я ніколі не пабачу і не атрымаю тут. І сапраўды, тое, што я пабачыла там, у бібліятэках, мяне ўзрушыла. Таму што я ніколі не бачыла такой велізарнай колькасці кніг, скажам, па тым, што ў іх называецца «руская культура». Дарэчы, для амерыканцаў дагэтуль існуюць паняцці Савецкі Саюз, савецкая культура, савецкае кіно... А дзяржава Беларусь, у прынцыпе, не вядомая. Беларуская культура ім таксама не знаёмая, абсалютна. І калі пачынаеш тлумачыць, што дзяржава Беларусь размяшчаецца паміж Расіяй і Польшчай — гэтыя геаграфічныя паняцці ў іх на слыху, — яны ўсё адно пытаюць: а што гэта, Беларусь?.. Калі я была ў сусветна вядомых музеях: Метраполітэн Музей, Музей сучаснага мастацтва,— і пабачыла карціны Марка Шагала, падпісаныя «Марк Шагал. Беларусь», у мяне слёзы навярнуліся ад гонару. Разумееце, не Расія, не Парыж, а Беларусь...

Дык вось, тое, на што я разлічвала, я атрымала. Я ехала пачарпнуць інфармацыю з кніг, і я акунулася ў гэтыя кнігі з галавой. Па-другое, я ведала, што ў мяне будуць зносіны з калегамі. Гэта я таксама атрымала. Потым, я ведала, што як выкладчык я магу паглядзець, як там адбываецца навучальны працэс, а менавіта тыя дысцыпліны, якія мяне цікавяць — па культуры і па мастацтву. Я ўсё гэта атрымала.

Раніцой я сыходзіла ў бібліятэку — гэта было кожны дзень. У шэсць гадзін раніцы я падымалася і к васьмі ўжо была ў бібліятэцы. Я там пабачыла вялізную колькасць кніг пра савецкіх рэжысёраў. А столькі кніг аб Таркоўскім, яго дзённікі я нідзе не бачыла...

Пасля бібліятэкі, у залежнасці ад таго, які быў план, я альбо сустракалася з выкладчыкамі М. І. Т. (Масачусетскі інстытут тэхналогій), асабліва мяне цікавіў кінафакультэт, альбо ішла ў Паўночна-Усходні універсітэт, дзе знаходзіўся факультэт журналістыкі. Але часцей за ўсё я хадзіла ў Гарвард. На тэрыторыі Гарварда размешчаны кінаархіў. У ім наладжваліся прагляды для студэнтаў па вечарах, там ішлі фільмы для людзей, якія проста любяць і ведаюць кіно. Праходзілі кінасемінары, сустрэчы з кінакрытыкамі, і паўсюль я прымала ўдзел. На адной з такіх сустрэч я выступіла, і пасля майго маналога пра савецкае кіно мне заапладзіравалі. І праз некалькі дзён, калі я ўжо адышла ад гэтага семінара, да мяне падыходзілі і дзякавалі з захапленнем. І гэты момант маёй біяграфіі я буду памятаць, напэўна, усё жыццё...

**— Скажыце, пабываўшы на лекцыях, пагаварыўшы з выкладчыкамі, Вы, напэўна, можаце параўнаць амерыканскую сістэму адукацыі з нашай. Ці існуе розніца і ў чым?**

— Вы ведаеце, розніца вось у чым: там не прымушаюць студэнтаў вучыцца пяць гадоў. Не прымушаюць.

**— У сэнсе?**

— Гэта значыць, там сістэма адукацыі складаецца з трох ступеняў. Першая — гэта прафесійная частка. Ты вывучаеш на працягу двух гадоў спецыяльныя прадметы. І за два гады ты вызначаешся: варта табе вучыцца далей або не? Калі не, ты ідзеш працаваць. Калі ў цябе ёсць жаданне працягваць навучанне, ты вучышся яшчэ два ці тры гады (у залежнасці ад ВНУ). Як ты вучышся?.. Ты вывучаеш аграмадную колькасць разнастайных прадметаў. Справа ў тым, што ў іх вельмі кепская сярэдняя адукацыя, і яны ведаюць пра гэта. Нашыя школьнікі вывучаюць значна болей прадметаў, чым іх школьнікі. І вось гэтыя прабелы ў школьнай адукацыі яны запаўняюць у ВНУ. На журфаку студэнты вывучаюць усё: астраномію, фізіку, хімію...

Амерыканскія студэнты навучаюцца ў бібліятэках. Гэта тое, што ў нас страчана. Я не ведаю, з каго спытаць і каго ў гэтым абвінавачваць. Студэнтаў я не абвінавачваю — ім трэба неяк выжываць, зарабляць грошы. Але ў нас страчана галоўнае — жаданне адукоўваць сябе...

Такім чынам, розніца ў адукацыі вось у чым — студэнт мае права выбару. Студэнт вольны, ён асоба, якой давяраюць. У яго ёсць права выбару, але гэты выбар абавязвае. Ты выбраў на другой ступені пяць ці шэсць спецкурсаў — меней нельга, болей можна, — ты павінен вучыцца. Калі ты прапускаеш заняткі, адміністратыўная частка дасылае табе пісьмовае паведамленне: Вы прапусцілі, будзьце ласкавы адпрацаваць.

**— Добра, а якія вынікі? Узровень ведаў? Яны дамагаюцца таго, каб гэтыя прабелы ў сярэдняй адукацыі ліквідаваліся?**

— Так. Вы ведаеце, я жыла ў студэнцкім інтэрнаце. Мне было вельмі цікава паназіраць, што такое іх студэнцкае жыццё. Я жыла з дзяўчынай гадоў дваццаці, карэянкай. Цікава, у яе быў сябар з Украіны... Яны вельмі адукаваныя людзі. Не толькі ў галіне сваёй спецыяльнасці, але і ў галіне культуры, мастацтва, яны чытаюць велізарную колькасць кніг. І я не памятаю такога дня, каб мая суседка праспала і не пайшла б на лекцыі. Я не памятаю, каб у выхадныя дні яна некуды паехала і расслабілася. І нават у святы яна хадзіла ў бібліятэку.

**— Ці ёсць розніца паміж студэнцкім жыццём амерыканскіх студэнтаў і нашых?**

— Гм, як Вам сказаць... Я не ведаю, можа, гэта менталітэт наш такі, стыль, прывычка такая, але ў нас вось гэтая кампанейскасць...

**— Кухоннасць...**

— Так-так, агульны побыт, гэта вельмі развітае. У іх гэтага няма.

**— Вы самі падчас, як былі студэнткай, жылі ў інтэрнаце?**

— Так, я жыла ў інтэрнаце. Але мы тады, калі параўноўваць з цяперашнім інтэрнатам, чыталі кнігі, сядзелі ў чытальнай зале і працавалі! Зараз жа гэтага няма! Ну добра, грошы трэба зарабляць, але... Відаць, калі пачынаецца перакос у эканоміцы, сацыяльным жыцці, ён паўсюль пачынаецца, гэты перакос... А там?.. Студэнты занятыя сваёй справай. Яны не здабываюць грошы.

**— А ў госці адзін да аднаго ходзяць студэнты ў інтэрнаце?**

— Не-не, гэта не прынята. Увогуле, да слова сказаць, амерыканцы вельмі раз'яднаны народ. Там нават не прынята сем'ямі сябраваць. Разумееце, тое, што ёсць у нас — нейкі агульны, саборны пачатак жыцця,— там гэтага няма. І ад гэтага адчуваеш самоту. Амерыканцы — народ дастаткова халодны, прагматычны. У іх няма таго, што называецца душэўнай шырынёй. Увогуле, паняцце душэўнасці ў амерыканскім жыцці адсутнічае. Можа, таму ў іх краіне і ў сістэме адукацыі такая моцная цікавасць да дзвюх культур — японскай і савецкай. І калі я пытаю: а чаму савецкая? — яны кажуць: гэта вялікая культура, таму што духоўная. Дарэчы сказаць, з нагоды адукацыі, яшчэ чым яна адрозніваецца: незалежна ад ВНУ вельмі вялікая колькасць прадметаў па мастацтву і культуры. Праз гуманітарныя прадметы праходзяць усе студэнты: фізікі, хімікі...

**— Мяркуючы па Вашых расповядах, Вы добра спазналі Амерыку. Вы хутка прывыклі да гэтай краіны?**

— О, не. За тры месяцы я да Амерыкі так і не прывыкла. Гэта нейкая вялізная і вельмі халодная краіна. І гэта пры тым, што побыт у ёй неверагодна зручны. Ідэальны варыянт — працаваць у Амерыцы нейкі час. Табе прадастаўляецца ўсё: асобнае памяшканне, камп'ютэр, ксеракс, цябе пазнаёмяць з усімі выкладчыкамі, якія змогуць дапамагчы і даць патрэбную інфармацыю. Але, табе дапамогуць. Аднак пры гэтым яны халодныя, ім няма справы да цябе і тваіх праблем. І мая душа не прыняла Амерыку.

**— З якімі настроямі Вы вярнуліся?**

— Вы ведаеце, у мяне быў неверагодна прыгнечаны стан. І, відаць, я ў гэтым не арыгінальная, бо я чула, што шмат якія людзі вяртаюцца ў падобным стане. Разумееце, у мяне ж была магчымасць працягнуць камандзіроўку, але пры адной умове — не вяртацца. Аднак я не магла болей там заставацца. Я проста не магла... Адна з прычын — гэта тое, што называецца настальгіяй. Я не магу, як гэта ні банальна і гучна сказана, доўга быць без Радзімы. Калі б можна было вярнуцца, глынуць гэтага паветра, пабачыць сваё, роднае, а потым назад — такі варыянт мяне б задаволіў. Але... Калі прыязджаеш сюды, дэпрэсія пачынаецца не таму, што там добра...

Я ведаю, што я ніколі не буду эмігранткай... Ніколі. Дэпрэсія наступае не таму, што ты сышоў ад таго, добрага жыцця, а ад болю, што тут так кепска. Неімавернае пачуццё болю: чаму так кепска?! Я перакананая, у тых выкладчыкаў болей магчымасцей лепей выкладаць, значна болей матэрыяльных сродкаў. Але я не магу сказаць, што іх выкладчыкі метадычна выкладаюць лепей за нашых. Альбо выкладаюць неяк вельмі арыгінальна. Я не магу гэтага сказаць. Як і таго, што іх выкладчыкі інфармацыйна болей насычаныя і ведаюць болей, чым нашыя выкладчыкі.

**— Пры той каласальнай тэхнічнай аснашчанасці...**

— Так. Гэта адзінае, у чым я не адкрыла для сябе Амерыку. Вось тут адкрыццяў не адбылося. Я абсалютна перакананая, што нашыя выкладчыкі не горш, а часам і лепш. Я не ведаю, што б рабіў амерыканскі выкладчык, увайшоўшы ў зусім нічым не абсталяваную аудыторыю, дзе яму трэба чытаць лекцыі па гісторыі мастацтваў. Ен нічога не змог бы зрабіць. Я не ўяўляю ступені здзіўлення амерыканца, увайдзі ён у кастрычніку ў аудыторыю, якая не ацяпляецца...

**— Людміла Пятроўна, а што могуць чакаць студэнты ад Вашай паездкі?**

— Ну, што студэнты могуць чакаць ад выкладчыка? Ведаў. І чым гэтыя веды глыбей і сучасней, тым больш студэнты выйграюць ад гэтага.

● КОНКУРСЫ

# МЕЖДУНАРОДНАЯ СОРОСОВСКАЯ ПРОГРАММА ОБРАЗОВАНИЯ В ОБЛАСТИ ТОЧНЫХ НАУК ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС

Дипломы Заслуженного Соросовского профессора будут вручены ученым не моложе 70 лет, чей вклад в мировую науку в области физики, математики, химии, биологии и наук о Земле неоспорим. Право выдвижения кандидатов на это звание предоставлено любому доктору физико-математических, химических, биологических или геолого-минералогических наук. Самовыдвижение не разрешено. Ежегодный доход кандидата не должен превышать 3 тысяч долларов США. Каждый представляющий кандидата должен сообщить сведения, содержащиеся в прилагаемой анкете.

Анкеты должны быть отправлены заказным письмом в ISSEP до 25 марта 1995 года (регистрация по почтовому штемпелю).

Решение о присуждении гранта принимается советом ISSEP по представлению Консультативного Совета подпрограммы «Соросовские профессора».

Адрес: 220072, г. Минск, пр. Ф. Скорины, 66, «Международная Соросовская программа образования в области точных наук». Контактный телефон: (0172) 39-57-45.

### АНКЕТА НОМИНАЦИИ КАНДИДАТА НА ПОЛУЧЕНИЕ ЗВАНИЯ «ЗАСЛУЖЕННЫЙ СОРОСОВСКИЙ ПРОФЕССОР»

**1. Сведения о номинируемом кандидате**

Фамилия, имя и отчество кандидата.

Дата рождения (число, месяц и год согласно записи в паспорте и № паспорта).

**Сведения, представляющие, на ваш взгляд, особую важность для присуждения звания**

Научные открытия и достижения (просьба кратко описать основные; если имеются дипломы об открытиях, привести точное название диплома, год вручения и номер диплома).

Любые другие сведения, которые могут облегчить принятие решения о выдаче гранта данному кандидату.

**Формальные сведения о кандидате**

Ученые звания и степени (с указанием, когда эти звания или степени были присвоены).

Членство в отечественных и иностранных академиях наук с указанием характера членства (действительный член, член-корреспондент, иностранный член, почетный член, академик-секретарь, член президиума, вице-президент, президент) и время избрания.

Научные награды кандидата (национальные и международные премии в области науки, государственные премии в области науки, избрание руководителями международных конгрессов и научных обществ в ранге президента, вице-президента и генеральноо секретаря, членство в редколлегиях международных изданий).

Сведения о всех доходах номинируемого в 1994 году, включая заработную плату, пенсию, академические выплаты, гонорары, полученные за публикации, чтение лекций и консультации, в том числе за рубежом, доходы от инвестиций в банки и другие доходы.

**2. Сведения о номинаторе**

Фамилия, имя и отчество.

Место работы и занимаемая должность.

Ученые звания и/или степени (с указанием, когда эти звания и/или степени были присвоены: №№ диплома ВАКа для каждого из них).

Адрес, телефон, факс и e-mail, по которым легко связаться с номинатором. Подпись.....

---

Международная Соросовская программа образования в области точных наук (ISSEP) в Беларуси объявляет конкурс, предназначенный для поддержки лучших преподавателей высшей школы на получение гранта «Соросовский профессор».

В результате конкурса будут отобраны лучшие профессора точных наук (физика, химия, биология, математика, науки о Земле), которые получат звание «Соросовский профессор» и персональный грант на два года, начиная с 1995 года.

Финансовая поддержка Соросовского профессора состоит из следующих позиций: персональная поддержка — 3000 долларов США в год, личный фонд (для поездок на научные конференции и другие производственные нужды) — 750 долларов на два года, оплата временного технического секретаря (на то время, когда профессор работает над новыми книгами или статьями) — 225 долларов США в год.

В соответствии с решением совета ISSEP право самовыдвижения на звание «Соросовский профессор» предоставлено всем ученым в ранге профессора или доктора наук, в том числе профессорам или докторам наук из исследовательских институтов, читающих студентам вузов курс лекций самостоятельно от начала до конца. Выдвижение кандидатов на звание «Соросовский профессор» допускается также коллегами в ранге профессора, доцента, доктора или кандидата наук.

Для получения звания «Соросовский профессор» кандидат должен:

1) иметь звание профессора или степень доктора наук;

2) преподавать в вузе, читая полный курс лекций студентам;

3) быть научным руководителем защитивших кандидатские диссертации (всего не менее 5 диссертантов);

4) иметь по крайней мере 5 научных публикаций с 1990 года, включая статьи в реферируемых журналах бывшего Советского Союза (список журналов прилагается), монографии, учебники или статьи в иностранных журналах (исключая тезисы докладов на конференциях);

5) иметь годовой доход, не превышающий 7,5 тысячи долларов (в случае нахождения Соросовского профессора с лекциями за границей в течение не более полугода в каждый календарный год персональная поддержка за этот период ему не выплачивается).

Представление кандидата должно сопровождаться анкетой с ответами на вопросы, которые публикуются ниже.

Материалы с номинацией кандидатов должны быть отправлены заказным письмом не позднее 25 марта 1995 года по адресу: 220072, г. Минск, проспект Ф. Скорины, 66, «Международная Соросовская программа образования в области точных наук». Контактный телефон: (0172) 39-57-45.

### АНКЕТА КАНДИДАТА НА ЗВАНИЕ «СОРОСОВСКИЙ ПРОФЕССОР»

Фамилия, имя, отчество.

Год рождения.

Образование, ученые степени и звания (прилагаются копии документов).

Основная специальность.

Стаж педагогической работы в вузах.

Место работы за последние 10 лет с указанием занимаемых должностей.

Циклы лекций по основным курсам и спецкурсам, которые читал соискатель в 1993—1994 учебном году и которые читает в 1994—1995 учебном году с указанием их объемов в часах, вуза, факультета, курса и числа студентов, слушавших лекции.

Краткое изложение представлений соискателя о том, как должен строиться процесс обучения и какие методы улучшения высшего образования хотел бы он предложить.

Список лиц, защитивших кандидатские диссертации под руководством кандидата в Соросовские профессора с указанием названий диссертаций. В случае, если представляемый был соруководителем, указать, кто был другим соруководителем (прилагаются копии титульных листов с оборотом не менее 5 авторефератов диссертаций).

Список лиц, у которых представляемый на соискание звания «Соросовский профессор» был научным консультантом по докторской диссертации.

Место работы бывших аспирантов и докторантов соискателя (в должностях не ниже доцента или старшего научного сотрудника).

Список основных публикаций за последние 5 лет (прилагаются оттиски или копии наиболее важных из них).

Список учебников для вузов и школ, практических руководств для студентов, монографий, подготовленных за весь период работ соискателя (прилагаются копии титульных листов).

Главные научные достижения соискателя и руководимого им коллектива.

Имеющиеся премии (государственные, международные и другие) и награды. Полученные или ожидаемые гранты на исследования.

Другие сведения, которые могут оказаться существенными для конкурса.

Сведения о всех доходах номинируемого в 1994 году, включая заработную плату, пенсию, академические выплаты, гонорары за публикации, чтение лекций за рубежом, доходы от инвестиций в банки и другие доходы.

Адрес, телефоны (рабочий и домашний), факс, e-mail кандидата.

Сведения о номинаторе (если кандидат в Соросовские профессора обратился с запросом не сам).

Фамилия номинатора, его ученые степени и звания, место работы.

Указать, какую роль сыграл кандидат в жизни номинатора (учитель, научный руководитель, коллега, ученик).

Адрес, телефоны, факс, e-mail номинатора.

Подпись.

* * *

Выбор лучших профессоров точных наук будет основан на следующей процедуре:

НА СТАДИИ 1 все желающие участвовать в конкурсе или представляющие на конкурс своих коллег обязаны заполнить приведенную анкету с соблюдением перечисленных выше обязательных условий;

НА СТАДИИ 2 студентам вузов, где работают профессора и доктора наук, номинированные для участия в конкурсе Соросовских профессоров, будут розданы анкеты с вопросами о научной и преподавательской деятельности кандидатов. Результаты оценки преподавателей их студентами станут важным критерием отбора кандидатов;

НА СТАДИИ 3 дополнительная информация будет получена путем учета числа выдающихся публикаций претендента, его индекса цитирования, написанных им для вузов и школ учебников, практических руководств для студентов, монографий и других объективных показателей. Победители конкурса должны сочетать активную преподавательскую деятельность в вузах с выдающимися показателями в научной работе и воспитании ученых.

### СПИСОК ЖУРНАЛОВ, ПУБЛИКАЦИЙ СТАТЕЙ В КОТОРЫХ БУДУТ ПРИНИМАТЬСЯ ВО ВНИМАНИЕ МЕЖДУНАРОДНОЙ СОРОСОВСКОЙ ПРОГРАММОЙ ОБРАЗОВАНИЯ В ОБЛАСТИ ТОЧНЫХ НАУК

Акустический журнал, Алгебра и анализ, Алгебра и логика (Сибирское отделение РАН), Архив анатомии гистологии и эмбриологии (морфология), Астрономический вестник, Астрономический журнал, Астрофизика, Биологические мембраны, Биология моря, Биоорганическая химия, Биополимеры и клетка, Биофизика, Биохимия, Ботанический журнал, Бюллетень экспериментальной биологии и медицины, Бюллетень Московского общества испытателей природы, серия биологическая, Вестник Московского университета (Серия 1. Математика. Механика, Серия 2. Химия, Серия 3. Физика. Астрономия, Серия 4. Геология, Серия 16. Биология, Серия 17. Почвоведение), Вестник Санкт-Петербургского университета (Физика, Химия), Вопросы вирусологии, Вопросы ихтиологии, Вопросы медицинской химии, Вопросы теории плазмы, Вулканология и сейсмология, Высокомолекулярные соединения (серия А, Серия Б), Генетика, Геологический журнал, Геология и геофизика, Геоморфология, Геотектоника, Геофизический журнал, Геохимия, Гидробиология, Гидрофизический журнал, Горный журнал, Дискретная математика, Дифференциальные уравнения, Доклады Академии наук Беларуси, Доклады Академии наук (России), Доклады Академии наук СССР, Доклады Академии наук Украины, Журнал аналитической химии, Журнал Всесоюзного химического общества им. Д. И. Менделеева, Журнал высшей нервной деятельности им. И. П. Павлова, Журнал вычислительной математики и математической физики, Журнал микробиологии, эпидемиологии и иммунологии, Журнал неорганической химии, Журнал общей биологии, Журнал общей химии, Журнал органической химии, Журнал структурной химии, Журнал технической физики, Журнал физической химии, Журнал эволюционной биохимии и физиологии, Журнал экспериментальной и теоретической физики, Записки Всероссийского минералогического общества, Зоологический журнал, Известия АН Беларуси, Известия высших учебных заведений (География, Математика, Радиофизика, Радиоэлектроника, Физика, Химия и химическая технология), Известия РАН (Серия Биологическая, Серия Геологическая, Серия Математическая, Серия Механика жидкости и газа, Серия Механика твердого тела, Серия Физика атмосферы и океана, Серия Физика Земли, Серия Физическая, Серия Химическая), Известия Сибирского отделения АН СССР (Серия химических наук), Измерительная техника, Иммунология, Кибернетика, Кинетика и катализ, Коллоидный журнал, Координационная химия, Косметические исследования, Краткие сообщения по физике ФИАН им. П. Н. Лебедева, Кристаллография, Лазерная физика (на английском языке), Магнитная гидродинамика, Математические заметки, Математический сборник, Металлофизика, Метеорология и гидрология, Механика жидкостей и газов, Механика композитных материалов, Механика твердого тела, Микология и фитопатология, Микробиология, Минералогический журнал, Молекулярная биология, Молекулярная генетика, Микробиология и вирусология, Научные доклады высшей школы: «Биологические науки», Нейрохимия, Нейрофизиология, Неорганические материалы, Океанология, Онтогенез, Оптика атмосферы и океана, Оптика и спектроскопия, Палеонтологический журнал, Паразитология, Петрология, Письма в «Астрономический журнал», Письма в «Журнал технической физики», Письма в «Журнал экспериментальной и теоретической физики», Поверхность, Физика, химия, механика, Почвоведение, Прикладная математика и механика, Радиационная биология, Радиоэкология, Радиотехника и электроника, Радиохимия, Реакционная способность органических соединений, Сибирский математический журнал, Сверхпроводимость: физика, химия, техника, Сверхпроводники, Теоретическая и математическая физика, Теоретическая и экспериментальная химия, Теория вероятностей и ее применение, Теория вероятностей и математическая статистика, Теплофизика высоких температур, Труды МИАН им. В. А. Стеклова, Труды Московского математического общества, Труды Санкт-Петербургского отделения Математического института им. В. А. Стеклова, Труды ФИАН им. П. Н. Лебедева, Украинский ботанический журнал, Украинский биохимический журнал, Украинский математический журнал, Украинский физический журнал, Украинский химический журнал, Успехи математических наук, Успехи современной биологии, Успехи физиологических наук, Успехи физических наук, Успехи химии, Фармакология и токсикология, Физика горения и взрывов, Физика и техника полупроводников, Физика металлов и металловедение, Физика низких температур, Физика твердого тела, Физика элементарных частиц и атомного ядра, Физиологический журнал, Физиология растений, Физиология человека, Функциональный анализ и его приложения, Физика Земли, Физика плазмы (на английском языке), Химико-фармацевтический журнал, Химическая физика, Химия гетероциклических соединений, Химия высоких энергий, Химия плазмы, Химия природных соединений, Цитология, Цитология и генетика, Экспериментальная биология, Электрохимия, Энтомологическое обозрение, Ядерная физика.

## ● ФОТАКОНКУРС



Узброеныя сілы інтэрната № 2. Фота Аляксея СУПРУНА.

## ● НАША ЗДАРОЎЕ

Некалькі карысных парадаў пры адсутнасці медыкаментаў.

# ПРАСТУДА

Пры першых прыкметах (ліхаманкавай ламоце цела, галаўным болі, насмарку, кашлі, павышанай тэмпературы і г. д.) трэба выпіць паўшклянкі вады, у якой разбоўтаць пяць кропель ёду. Пасля, калі прамочаныя ногі, нацерці іх гарэлкай і апрануць сухія шкарпэткі. Добра паставіць на грудзі і спіну гарчычнікі альбо сухія банькі, выпіць два-тры кубкі гарачага чаю з мёдам або патагоннага чаю — з ліпавага цвету, маліны. Затым добра захутацца і паспрабаваць заснуць. Звычайна пасля сну прастуда мінае. У зваротным выпадку на другі дзень трэба выпіць слабіцельнае і нічога не есці, толькі піць ваду, падкісленую лімонам ці журавінамі. На ноч нацерці цела гарэлкай або спіртавай настойкай ядлоўцу ці бярозавых почак. Праз гадзіну хворы, як правіла, прапацее. Трэба змяніць бялізну на сухую, і ўвогуле бялізну трэба мяняць часцей. Раніцой варта прыняць лёгкую ежу.

Калі гарачка да раніцы ўсё ж такі не мінае і прастуда адчуваецца ва ўсім целе, варта звярнуцца да доктара, бо гэта можа быць пачаткам нейкай сур'ёзнай хваробы.

Калі ліхаманка выступае на вуснах і ў носе, яе трэба прымочваць некалькі разоў на дзень спіртам або адэкалонам, але не мазаць мазямі. Пры высыпаннях на слізістай абалонцы рота трэба паласкаць яго некалькі разоў на дзень гарачай вадой.

**Кашаль** бывае ад самых розных прычын. Часцей за ўсё — ад прастуды.

Пры настойлівым кашлі рэкамендуюцца наступныя сродкі.

Дробна нарэзаць вялікую цыбуліну, засыпаць яе дзвюма сталовымі лыжкамі цукру, настойваць ноч, а на другі дзень паступова з'есці. Калі будзе непрыемна есці салодкую цыбулю, то трэба выпіць хаця б атрыманы сок. І так некалькі дзён.

Калі пры кашлі збіраецца шмат макроты і яна аддзяляецца з цяжкасцю, добра выпіць адзін-два кубкі ў дзень гарачага настою алтэйнага кораню (чайная лыжка з верхам кораню на шклянку кіпеню) альбо выпіць нашча паўшклянкі цёплай вады з паловай чайнай лыжкі соды і калівам солі.

Калі кашаль мучыць па раніцах, трэба зварыць часнок з цукрам і патрошку з'есці на пусты страўнік.

Калі кашаль не дае заснуць увечары, трэба выпіць шклянку гарачай вады з трыма кроплямі ёду.

Хутка супакойвае самы моцны кашаль сок чорнай рэдзькі з цукрам (на Ваш густ). Яго п'юць па сталовай лыжцы праз кожную гадзіну.

**Насмарк** — гэта катаральнае запаленне слізістай абалонкі носа. Пры ім прымяняюць такія сродкі.

Нюхаюць кожныя паўгадзіны нашатырны спірт, але па чарзе кожнай ноздрай.

Намазваюць пяткі ёдам, апранаюць цёплыя шкарпэткі і спяць у іх.

Робяць увечары для ног вельмі гарачую ванну з содай, соллю ці гарчыцай, пасля ваннай трэба нацянуць цёплыя шкарпэткі.

На працягу сутак абмяжуйце піццё. Абмяжуйце сырую гародніну і садавіну: у іх шмат вады.

**Старадаўнія знахарскія сродкі:**

— пры першых жа прыкметах насмарку свежыя гарчычнікі прыкласці да пятак і апрануць шкарпэткі. Трымаць ад адной да дзвюх гадзін. Выкарыстоўваць гэты сродак перад сном;

— прамачыць ваўняную тканіну воцатам, сланечнікавым алеем і камфарай, прыкасці яе да грудзей на ноч. На шыю ззаду пакласці кампрэс з працёртага хрэна.

Знахары лякуюць жорсткія прастуды сухой гарчыцай: яе насыпаюць у шкарпэткі і ходзяць так некалькі дзён. Сродак просты і эфектыўны.

**Доктар Н. В. КРАСІЛЬНІКАВА,**
**паліклініка № 33.**

## ● ВІЗІТОЎКА

***Раіса Яўгенаўна ЖАРНАСЕК — студэнтка-завочніца беларускага аддзялення філалагічнага факультэта БДУ; працуе выхавальніцай дзіцячага садка № 4 горада Стоўбцы. Вершы яе друкаваліся ў раённай газеце і часопісе «Вясёлка».***

### Наша жыццё

Жыццё наша — напісаная кніга
І як прыемна ў руках трымаць,
Ды толькі ў адрозненне ад кнігі
З жыцця старонак нельга вырываць.

Жыццёвую паэтыку чытаем.
Тут ёсць высокі, ёсць і нізкі стыль,
Імгненні цяжкія — мы пра сябе ўздыхаем.
Не націскай на душу больш, дактыль!

Жыццё пражыць — не поле перайсці,
І сораму ў кішэню не збярэш,
Каб без памылак к фінішу дайсці:
Сем раз адмерай, ды адзін адрэж!



## ● ЗАЗІРНІЦЕ!

# ЧЫМ ЖЫВЕ БІБЛІЯТЭКА

Кожны тыдзень у галоўным корпусе БДУ ў бібліятэцы праводзіцца выстава новай літаратуры. Яна можа задаволіць самага патрабавальнага чытача.

Асабліва шмат каштоўных кніг можна ўбачыць у зале замежнай літаратуры. Больш за ўсё тут выданняў на нямецкай мове. Гэта абумоўлена дапамогай, якую Нямецкі бібліятэчны інстытут у Берліне і федэральнае міністэрства адукацыі і навукі Германіі аказалі беларускім бібліятэкам, падтрымаўшы іх грашыма і кнігамі.

У 1994 годзе бібліятэкі Беларусі атрымалі не толькі 730 тысяч марак, але і каля 1500 назваў навучальнай літаратуры. Гэта навейшыя нямецкія падручнікі па гісторыі, філасофіі, хіміі, фізіцы, эканоміцы (з раздзелаў, якія адчуваюць найбольшую патрэбу ў абнаўленні), а таксама разнастайныя даведнікі, відэаматэрыялы.

Універсітэцкая бібліятэка мела магчымасць на месцы, самастойна выбраць актуальную навуковую заходнюю літаратуру, зыходзячы са сваіх патрэб, інтарэсаў навукоўцаў і студэнтаў. Так што літаратуры на замежных мовах у бібліятэцы хапае, чаго, на вялікі жаль, нельга сказаць пра кнігі на роднай мове, у якіх адчуваецца найбольшая патрэба.

Ёсць і праблемы. Кнігі са сховішча прыходзіцца насіць на руках, бо няма пад'ёмніка.

Добра было б паставіць у памяшканні бібліятэкі ксеракс, каб кожны, хто пажадае, мог зрабіць патрэбную копію — тады б настаўнікі не трымалі літаратуру па 25—30 гадоў, а студэнты не выдзіралі б старонкі.

Будзем спадзявацца, што ў бліжэйшай будучыні бібліятэка будзе трымацца не толькі на энтузіязме сваіх супрацоўнікаў і на гуманітарнай дапамозе, але і нашы ўлады звернуць увагу на культуру.

**Валлерыя АЎСЯНІК.**

# Карысныя парады

Вы, нарэшце, звярнулі ўвагу на сваю скуру?

Не спяшайцеся наведваць знакаміты «Ланком». Пачнём лепш з больш таннага.

Напрыклад, з кіслага малака ці кефіру — вельмі карысны сродак для ранішняга ўмывання твару. У палову шклянкі кіслага малака дадайце 0,5 чайнай лыжкі солі, размяшайце. Акуратна намажце гэтай сумессю скуру твару і шыі. Праз 10—15 хвілін змыйце вадой ці разведзеным малаком. Скуру не выцірайце!

Калі скура вельмі сухая, вазьміце 2 сталовыя лыжкі смятаны, дадайце крыху солі. Пamажце скуру твару і шыі. Праз 10—15 хвілін збярыце лішак на ватны тампон, змочаны вадой. Скуру не выцірайце.

І наогул, вярнуўшыся дадому, не спяшайцеся ўмывацца вадой. Лепш нагрэйце алей і акуратна памажце ім твар і шыю. Затым ватным тампонам па масажных рысах ачысціце скуру.

Зразумела, скуру трэба вітамінізаваць. Самае простае — яблычнае лупіне. Заліце лупінне аднаго яблыка вадой, дайце закіпець і астудзіце, не адчыняючы каструлю. Памыўшыся яблыкавай вадой, Вы адразу адчуеце, якой пругкай зрабілася Ваша скура.

І, нарэшце, ізноў пра саламу прыгажосці. Некалькі сталовых лыжак «геркулесу» заліць шклянкай малака, а раніцай дабавіць туды пацёрты яблык, сухую гародніну, арэхі. Вось толькі на цукар і масла на гэты час забудзьцеся!




*Малявау ужо вядомы чытачам нашай газеты Опричь КРОМЕШНИЙ.*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ БЕЛАРУССКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

23 лютага. Зак. 651. Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара Т. М. КАЗАК